Карацееў А.Л.,
канд.мастацтвазнаўства,
дацэнт

# ПРАФЕСІЙНЫЯ ЗАДАЧЫ ВЫКЛАДЧЫКАЎ У АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ І ІНДЫВІДУАЛЬНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ КІРАЎНІКОЎ ДУХАВЫХ, ЭСТРАДНЫХ АРКЕСТРАЎ У ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧЫМ ПРАЦЭСЕ ДВУХУЗРОЎНЕВАЙ СІСТЭМЫ ВЫШЭЙШАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ УСТАНОВЫ

1. Рэтраспектыўны метад даследавання дазволіў нам аптымальна рэканструяваць асаблівасці працэсу падрыхтоўкі выканаўцаў музычных твораў на духавых інструментах. Неабходна адзначыць, што выканаўцы, якія прайшлі дастатковую аркестравую практыку, атрымалі добрыя музычна-тэарэтычныя веды, вельмі плённа кіруюць прафесійнымі ці аматарскімі калектывамі.

Вывучэнне розных крыніц дазваляе канстатаваць, што працэсу падрыхтоўкі выканаўцаў музычных твораў на духавых інструментах у Беларусі ўласцівы аб'ектыўна-паступальны характар: традыцыйныя спосабы падрыхтоўкі музыкантаў удасканальваліся, а на змену ім прыходзілі больш прагрэсіўныя сістэмы навучання выканаўцаў як па форме, так і па зместу. Своеасаблівасцю, напрыклад, характарызуецца сістэма падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых інструментах ў музычных бурсах іезуітаў ужо ў ХУІ стагоддзі (Полацк, Нясвіж, Орша і інш.). На новым мэтанакіраваным узроўні была арганізавана падрыхтоўка музыкантаў у больш дасканалай форме інструментальнага ансамбля - інструментальныя капэлы ХУІ-ХУП стст. ("літоўская капэла" Зігмунта-Аўгуста ў Гродне ў 1543 г. і інш.). У ХУШ стагоддзі на Беларусі склалася сістэма падрыхтоўкі музыкантаў у прыгонных аркестрах прыдворных тэатраў (з інструментаў адзначым флейты, габоі, фаготы, валторны, трубы і інш.). У гэтых калектывах існавалі музычныя школы (Нясвіж, Ружаны, Гродна, Паставы і інш.). Неабходна адзначыць і падрыхтоўку музыкантаў у аматарскіх духавых аркестрах сярэдніх навучальных устаноў ХІХ-- пач.ХХ ст. (Мінск, Магілёў), аркестрах пажарнікаў ХІХ ст., музычных студыях, народных кансерваторыях ў 2О-я гады нашага стагоддзя, музычных тэхнікумах (вучылішчах) у 30-я гады, сучасных пачатковых, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах (музычныя школы, сярэднія агульнаадукацыйныя школы з мастацкім ухілам, музычныя ліцэі, вучылішчы, Беларуская акадэмія музыкі, Беларускі універсітэт культуры).

Аналіз падрыхтоўкі музыкантаў для духавых аркестраў Беларусі на ўсіх этапах іх развіцця, для сучасных эстрадных аркестраў дазваляе зрабіць вывад аб тым, што ў падрыхтоўцы музыкантаў значную ролю займалі індывідуальныя заняткі, паслядоўная сістэма самастойных заняткаў навучэнцаў у час іх самападрыхтоўкі, а таксама інтэнсіўная аркестрава-выканальніцкая практыка. Дасягненні ў развіцці індывідуальных выканальніцка-мастацкіх якасцей музыкантаў, безумоўна, павінны намі выкарыстоўвацца.

Мы ў сваю чаргу лічым, што адной з найважнейшых умоў аптымізацыі і інтэнсіфікацыі вучэбнага працэсу у ВНУ з'яўляецца арганічнае спалучэнне і ўзаемасувязь індывідуальных і самастойных заняткаў студэнтаў, у тым ліку і студэнтаў, якія будуць рыхтавацца да абароны дыпломаў бакалаўраў і магістраў па кафедрах духавой і эстраднай музыкі.

П. Самастойныя заняткі студэнтаў, якія будуць атрымліваць дыпломы бакалаўраў ці магістраў, павінны мець канкрэтны змест. Так, напрыклад, для бакалаўраў гэта можа быць наступнае кола пытанняў: 1) сістэма ранішніх першапачатковых заняткаў (работа над падоўжанымі гукамі, выкананне кварта-квінтовых скачкоў на legato, выкананне так званых "педальных гукаў" на медных духавых інструментах і інш.; 2) падрыхтоўка да работы над гамамі, эцюдамі (практыкаванні па сістэмах Яроміна, Іагансона, Коліна, Докшыцара, Хартмана-Карпа і інш.); 3) выкананне кантыленных фрагментаў перад работай над мастацкімі творамі.

Студэнты, якія рыхтуюцца да абароны дыплома магістра, акрамя названых пытанняў, павінны мець самастойныя навыкі работы над мастацкімі творамі: 1) аналіз стылістычных асаблівасцей канкрэтнага твора, выяўленне характэрных асаблівасцей творчасці кампазітара; 2) вывучэнне варыянтаў магчымых інтэрпрэтацый вывучаемага твора (знаёмства са спецыяльнай літаратурай, аналіз нотных рэдакцый, выкарыстанне фондаў фона- і відэатэкі); 3) асэнсаванне музычных вобразаў і пошук мастацка-выканальніцкіх сродкаў іх увасаблення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

III. Індывідуальныя заняткі з'яўляюцца таксама састаўной часткай вучэбнага працэсу. Нам уяўляецца, што яны павінны разглядацца ў некалькіх ракурсах: 1) аўдыторныя заняткі з выкладчыкам; 2) самастойны працэс засвойвання тых заданняў, якія вызначаны выкладчыкам і прызначаны для наступнай праверкі ў класе. Калі першы напрамак як традыцыйная форма навучання мае канкрэтна-рэгулюемыя рычагі і ступень асэнсавання матэрыялу залежыць ад навукова-метадычнай падрыхтоўкі выкладчыка, памножанай на актыўнасць і грунтоўныя веды студэнта, то другі напрамак мае рад арганізацыйна-метадычных цяжкасцей і праблем.

Абавязковай умовай, якая спрыяе дасягненню максімальных вынікаў працы студэнтаў, з'яўляюцца іх уменні збалансаваць усе віды і аб'ёмы індывідуальнай падрыхтоўкі. У першую чаргу неабходна вызначыць, якім відам заняткаў трэба адвесці максімальны час і ў якой паслядоўнасці засвойваць неабходны матэрыял. На наш погляд, мэтазгодна адразу вызначыць наступнае: калі ў адпаведнасці з гэтым падходам студэнт не на ўсіх відах заняткаў будзе паспяваць рашаць тыя ці іншыя пытанні, то трэба вывучаемы матэрыял падзяляць на акрэсленыя стадыі ці на канкрэтызаваныя фрагменты. Гэта дазволіць вызначыць і рашыць галоўныя і асноўныя праблемныя пытанні і развіваць першачарговыя практычныя навыкі. І таму індывідуальныя заняткі студэнты будуць планаваць, зыходзячы з уласнага бюджэту часу, які прызначаны для вучэбнага працэсу (аўдыторныя і пазааўдыторныя заняткі). З мэтай арганізацыі рацыянальнага падыходу мы прапануем выкладчыкам арыентаваць студэнтаў, якія рыхтуюцца да абароны дыплома бакалаўраў, наступны варыянт самастойнай пазааўдыторнай падрыхтоўкі індывідуальных заданняў:

1) "размінка" з выкарыстаннем прынцыпу свядомай актыўнасці для аднаўлення і падтрымкі эмацыянальнага тонусу (выкананне неабходнага комплексу разыгрывання, паўтор фрагментаў любімых твораў ці папулярных мелодый і да т.п.);

2) асэнсаванне атрыманага задання і яго размеркаванне на паслядоўныя стадыі, блокі, звёны і да т.п.;

3) вывучэнне тэхналагічнага матэрыялу, які будзе садзейнічаць развіццю тых ці іншых навыкаў з мэтай вырашэння выканальніцка-творчых задач мастацкага рэпертуару (праца над тэхнічнымі практыкаваннямі, гамамі і эцюдамі ў поўным аб'ёме, аркестравымі цяжкасцямі, асобнымі складанымі фрагментамі твораў і да т.п.);

4) давядзенне да дасканаласці тэхнічных заданняў ці выканальніцкага майстэрства мастацкіх твораў, атрыманых студэнтамі ад выкладчыка для павышэння выканальніцкага ўзроўню;

5) замацаванне падрыхтаванага матэрыялу і яго апрабацыя праз выкананне як "канцэртнага" варыянта або для сябе з выкарыстаннем магнітафона, візуальнае ўспрыманне пры дапамозе люстэрка, а лепей выкананне перад сваімі сябрамі. Гэта будзе дапамагаць развіццю навыкаў выканальніцкай практыкі, вызваленню ад пачуцця сцэнічнага хвалявання, развіццю ўмення ў час ігры сканцэнтроўвацца на вырашэнні толькі мастацкіх задач.

Падрыхтоўка студэнтаў, якія будуць рыхтавацца да абароны дыплома магістра, павінна прадугледжваць арганізацыю індывідуальных заняткаў ужо ў форме "майстар-класа", мець эпізадычны характар карэкціроўкі з боку выкладчыка тых ці іншых пытанняў, якія выклікаюць цяжкасці ў студэнта і датычацца мастацка-выканальніцкіх складанасцей. Такім чынам, індывідуальная падрыхтоўка магістраў будзе прадугледжваць і перыядычны кантроль з боку выкладчыка, а таксама і апрабацыю прафесійных якасцей саіскальніка ступені магістра ў час выступлення ў ролі саліста, аркестранта ці канцэртмайстара групы ў канцэртным калектыве навучальнай установы, у час правядзення індывідуальных заняткаў з навучэнцамі малодшых курсаў.

1У. Нягледзячы на тое, што і самастойныя, і індывідуальныя заняткі маюць уласны змест, у практыцы навучальнага працэсу ВНУ яны павінны ўзаемадзейнічаць, чаргавацца, знаходзіцца ў прамой ці ускоснай узаемасувязі. Так, напрыклад, на індывідуальных занятках без выкладчыка з усяго аб'ёму дадзеных у класе задач студэнт самастойна выбірае тыя ці іншыя сістэмы асобнай падрыхтоўкі, тыя ці іншыя накірункі, канкрэтны від работы і да т.п. А пры падрыхтоўцы самастойных відаў работы студэнт і вызначае заданне сам, і шукае спосабы яго рашэння.

Такім чынам, разглядаючы праблему ўзаемасувязі індывідуальных і самастойных заняткаў, іх рэгуляванне з боку выкладчыкаў на кожнай стадыі двухузроўневай сістэмы падрыхтоўкі, трэба канстатаваць, што пры захаванні названых умоў мы здзейснім паслядоўную

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

падрыхтоўку студэнтаў на аснове выканання канкрэтных заданняў. Але не толькі гэта. У працэсе іх выканання студэнты праяўляюць ініцыятыву, зацікаўленасць і творчы падыход. Гэта ў сваю чаргу спрыяе павышэнню ўзроўню прафесійных ведаў, якія так неабходны будучым кіраўнікам духавых, эстрадных аркестравых калектываў у іх прафесійнай працоўнай дзейнасці.

Валатковіч В.М.,
ст.выкладчык

## ПЕРСПЕКТЫВА РАБОТЫ ПРАДМЕТНА-МЕТАДЫЧНАЙ КАМІСІІ ПА ДЫРЫЖЫРАВАННЮ ВА ЎМОВАХ РЭФАРМАВАННЯ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВА

З мэтай вывучэння ўзроўню дырыжорскай падрыхтоўкі кіраўнікоў духавых, эстрадных аркестраў намі была прааналізавана дзейнасць і рэпетыцыйная работа дырыжораў эстрадных і духавых калектываў Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей. Вынікі аналізу дазваляюць зрабіць вывад аб тым, што агульны ўзровень тэхнікі дырыжыравання жадае лепшага. Нягледзячы на быццам бы і пісьмовую канцэртна-выканальніцкую дзейнасць калектываў трох абласцей, у наяўнасці аказалася няведанне многімі кіраўнікамі аркестраў асноўных кампанентаў дырыжорскага мастацтва і іх практычнага ўзнаўлення (такая карціна назіралася нават сярод кіраўнікоў, якія маюць спецыяльную дырыжорскую падрыхтоўку сярэдняга або вышэйшага звяна). Пры ўмове добрасумленнага вывучэння гэтых кампанентаў кіраўнікамі, карпатлівай адпрацоўцы тых або іншых элементаў па тэхніцы дырыжыравання творчыя поспехі калектываў былі б значна вышэйшымі ў плане мастацкага ўвасаблення і раскрыцця зместу твора.

У выніку аналізу мы прыйшлі да вываду, што гэта сітуацыя складаецца таму, што ёсць недахопы ў дырыжорскай падрыхтоўцы кіраўнікоў у час іх навучання ў той ці іншай навучальнай установе. Несур'ёзныя адносіны да адпрацоўкі асобных элементаў тэхнікі дырыжыравання назіраюцца часта і ў студэнтаў аркестравых спецыялізацый Беларускага універсітэта культуры. А гэта памнажае потым памылкі і перашкаджае знаходжанню шляхоў іх ліквідацыі.

Такім чынам, лічым лагічным вывад аб тым, што тэарэтычныя, тэхналагічныя і практычныя моманты комплекснай падрыхтоўкі спецыялістаў па дырыжыраванню самым непасрэдным чынам адбіваюцца на якасці творчай дзейнасці самадзейных або аматарскіх калектываў, а значыць, яны ўплываюць на агульны ўзровень мастацкай культуры рэспублікі.

У дырыжыраванні як відзе музычнай выканальніцкай дзейнасці на сучасным этапе маюцца высокія творчыя дасягненні, аднак, як адзначыў вядомы дырыжор Л.Стакоўскі, яно засталося адным "з самых туманных і няправільна ўспрыемых галін музычнага выканальніцкага мастацтва". У методыцы выкладання дырыжыравання таксама шмат супярэчнасцей. Пры наяўнасці шэрагу тэарэтычных распрацовак па тэхніцы дырыжыравання навучэнцу даволі складана сарыентавацца ў прадстаўленай інфармацыі па прычыне або значнай яе складанасці, або недастатковай асэнсаванасці ролі тэхнікі дырыжыравання як сродку дасягнення пэўнай мастацкай задачы. Мы паспрабавалі раскрыць змест дырыжыравання як сістэму ведаў, уменняў, навыкаў, як сістэму дзеянняў - уменняў. Трэба падкрэсліць, што працэс асваення дырыжыравання складаецца з двух відаў дзеянняў: асваенне музычнага тэксту ва ўсім аб'еме выразных сродкаў і фарміраванне мастацкіх задач; рэалізацыя творчых задач пры дапамозе дырыжорскай тэхнікі.

Пры асваенні любога прадмета важнай умовай з'яўляецца засваенне ведаў аб ім. У нашым выпадку, акрамя ведаў аб прадмеце, трэба вылучыць яшчэ і веды аб спосабах выканання канкрэтных дзеянняў.

Веды аб прадмеце ўключаюць наступнае:

- тэхніка дырыжыравання, яе функцыі;
- кампаненты дырыжорскага апарату, іх магчымасці;
- уласцівасці (змест) аўфтакта (хуткасць, амплітуда, працягласць, сіла, напрамак);
- структура аўфтакта (замах, імкненне, кропка, адлюстраванне);
- інфармацыйныя магчымасці аўфтакта;
- передача характару гучання, метра, тэмпу, рытму, дынамікі, пачатку гучання, зняцця яго.

Названыя веды дазваляюць засвоіць веды другога роду, што вынікаюць з першых. Да гэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ